УДК 94(476)«18/19» + 316.343-058.51«654»

**В.В. Кныш**

# Колькасны і сацыяльны склад жабракоў Беларусі (60–90-я гг. XIX ст.)

Жабрацтва, беднасць, галеча, матэрыяльныя пазбаўленні ўсялякага роду ва ўсе перыяды гістарычнага існавання чалавецтва былі яго спадарожнікамі, якія існавалі побач з дабрабытам, багаццем і раскошай. Існаванне «сацыяльнага дна» з яго жабракамі, бадзягамі і басякамі ў другой палове XIX ст. у Беларусі не было выключэннем. Жабракі займалі самую ніжэйшую прыступку сацыяльнай лесвіцы і прадстаўлялі адмоўны элемент грамадства, выступаючы ва ўяўленнях афіцыйных установ як «сацыяльнае зло».

Праблема жабрацтва ўжо шмат год звяртае на сябе ўвагу даследчыкаў. У гістарыяграфіі дадзенага пытання існуе шэраг прац, прысвечаных вывучэнню розных аспектаў праблемы. Але тым не менш тэма патрабуе комплекснага, навуковага даследавання, таму што большасць работ закранае або прыватныя пытанні або носіць агульны характар.

У другой палове XIX – напачатку XX стагоддзяў звесткі аб жабрацтве і яго прадстаўніках збіралі гісторыкі, этнографы, сацыёлагі, правазнаўцы, чыноўнікі. У перыяд з 60-х гг. XIX ст. па 30-я гг. XX ст. выйшлі працы расійскіх навукоўцаў А. Бахціярава, А. Левенсціма, Д. Лінёва, С. Максімава, І. Прыжкова, А. Свірскага, а таксама беларускіх этнографаў М. Нікіфароўскага і Е. Раманава [1–7]. У перыяд з 30-х па 90-я гг. XX ст. даследаванні па гэтай праблематыцы не праводзіліся. Сярод сучасных прац, прысвечаных пытанням дарэвалюцыйнага жабрацтва ў Расійскай імперыі, трэба вылучыць

даследаванні І. Галасенка, Н. Кузняцовай, Н. Раждественскай і інш [8–11]. У апошнія гады з'явіліся цікавыя публікацыі С. Шымуковіча, А. Грыгор'ева, М. Фірсава, А. Цішчанка, К. Кузміна, А. Холаставай і В. Мельнікава [10, 12–15]. У сваіх даследаваннях ва ўсе перыяды вывучэння праблемы навукоўцы разглядалі такія пытанні, як псіхалагічныя асаблівасці жабракоў, іх сацыяльную арганізацыю, апісвалі быт, традыцыі, метады і тыпалогію дзейнасці прафесійных жабракоў, а таксама формы барацьбы з гэтай антысацыяльнай з'явай. Па-за межамі іх даследаванняў засталіся пытанні колькаснага і сацыяльна-дэмаграфічнага складу і спецыфічных тэрытарыяльных асаблівасцей жабракоў Беларусі. Гэтыя праблемы закранаюцца толькі ў асобных работах і маюць эпізадычны характар. Таму ў дадзеным артыкуле ставіцца задача разглядзець акрэсленыя вышэй пытанні на прыкладзе беларускіх жабракоў.

Па вызначэнні сучасных сацыёлагаў жабракі – гэта людзі, якія не маюць магчымасці задавальняць свае матэрыяльныя патрэбнасці ў ступені, якая забяспечвае толькі фізіялагічнае выжыванне [16]. У дарэвалюцыйнай Расіі пад жабрацтвам разумелася крайняя або глыбокая галеча, а жабраком называлі чалавека, які жыў міласцінай.

Выяўленне колькаснага складу жабракоў заўсёды выклікала складанасць у сувязі з тым, што не ўсе ўбогія траплялі пад улік. У другой палове XIX – пачатку XX ст. дзейнічаў Камітэт па разборы і апекаванні жабракоў. Камітэт з'яўляўся дзяржаўнай установай, якая мела свае аддзяленні ва ўсіх губернях. У яе склад уваходзілі віцэ-прэзідэнт і восем членаў – юрысты і ўрачы, якія вялі бюлетэні аб усіх трапіўшых у поле зроку жабраках і запаўнялі на кожнага «разборны лісток». Апошні дакумент утрымліваў звесткі аб імені, прозвішчы, саслоўным становішчы, узросце, нацыянальнай і канфесійнай прыналежнасці, асобных прыкметах, стане здароўя, месцы жыхарства і рамястве жабракоў.

У 1907 г. у зборніку «Благотворительность в России» былі выдадзены статыстычныя звесткі аб колькасным і сацыяльным складзе жабракоў, якія былі атрыманы на падставе Першага ўсеагульнага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі (1897 г.).

Звесткі аб асобах, якія самастойна займаліся жабрацтвам, аб тых, для каго збіранне міласціны з'яўлялася пабочным рамяством, а таксама аб асобах, якія існавалі на сродкі першых і другіх па імперыі, Еўрапейскай Расіі і па беларускіх паветах, былі сфарміраваны на аснове дадзеных зборніку «Благотворительность в России» і прадстаўлены ў вышэйпрыведзенай табліцы, а дадзеныя па беларускіх паветах прадстаўлены ў межах пяці беларускіх губерній, якія ўваходзілі ў склад Беларусі ў канцы XIX стагоддзя.

Жабракі беларускіх губерняў, якія атрымлівалі сродкі ад жабрацтва, складалі 8% ад агульнай колькасці жабракоў па Еўрапейскай Расіі і 6% ад усіх жабракоў Расійскай імперыі. Больш жабракоў, якія самастойна займаліся жабрацтвам, было ў Віленскай губерні (3981 асоба), затым у Магілёўскай (3321), Віцебскай (3075), Гродзенскай (2503), найменшая колькасць назіралася ў Мінскай губерні – 2224 жабракі. Калі ж разглядаць асоб, якія займаліся жабрацтвам, як пабочным рамяством, вядучае месца займала Магілёўская губерня (477), а на апошнім – Гродзенская (226 асоб). Трэба адзначыць, што іх колькасць значна менш колькасці асоб, якія самастойна займаліся жабрацтвам. Гэта тэндэнцыя захоўваецца і ў дачыненні як да Еўрапейскай Расіі, так і да ўсёй імперыі.

Па меркаванні навукоўцаў, адносна невялікая колькасць жабракоў у беларускіх губернях звязана з менталітэтам жыхароў, калі толькі самая крайняя галеча магла прымусіць іх жабраваць. Згодна з перапісам насельніцтва 1897 г. у Віленскай губерні колькасць жабракоў складала 40 чалавек на кожныя 10 тыс. насельніцтва, у Віцебскай – 30 чалавек, у Магілёўскай – 25 чал., у Мінскай – 20 чал. і ў Гродзенскай – каля 2 чалавек [12].

Табліца

**Колькасць жабракоў па беларускіх паветах у канцы XIX ст. [17]**

| Губерні і вобласці | Агульная колькасць асоб, атрымліваючых сродкі да існавання жабрацтвам | | | У тым ліку | | | | Асобы якія займаліся жабрацтвам, як пабочным рамяством | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Асобы, якія самастойна займаліся жабрацтвам | | Асобы, якія жылі за кошт тых, хто самастойна займаўся жабрацтвам | | Агульная колькасць | | У тым ліку | | | |
| | | | | | | | | | | Асобы, якія мелі самастойныя заняткі | | Асобы, якія існавалі на сродкі тых, хто меў самастойныя заняткі | |
| | м. | ж. | аб.п. | м. | ж. | м. | ж. | м. | ж. | м. | ж. | м. | ж. |
| Віленская | 2333 | 3736 | 6069 | 1673 | 2308 | 660 | 1428 | 179 | 154 | 140 | 85 | 39 | 69 |
| Віцебская | 1861 | 2741 | 4602 | 1308 | 1767 | 553 | 974 | 170 | 251 | 114 | 117 | 56 | 134 |
| Гродзенская | 1741 | 2099 | 3840 | 1288 | 1215 | 453 | 884 | 126 | 100 | 95 | 38 | 31 | 62 |
| Мінская | 1721 | 1954 | 3675 | 1225 | 999 | 496 | 955 | 131 | 111 | 92 | 43 | 42 | 68 |
| Магілёўская | 1872 | 2107 | 3979 | 1378 | 1943 | 494 | 964 | 249 | 228 | 165 | 79 | 84 | 149 |
| Усяго па бел. губ. | 9528 | 12637 | 22165 | 6872 | 8232 | 2656 | 4405 | 855 | 844 | 606 | 362 | 252 | 482 |
| Усяго па губ. Еўрапейскай Расіі | 116562 | 156180 | 272742 | 91954 | 112181 | 24608 | 43998 | 16748 | 17195 | 11472 | 9008 | 5276 | 8187 |
| Усяго па імперыі | 159753 | 203448 | 363201 | 120660 | 133097 | 39093 | 70351 | 19037 | 19127 | 13199 | 9975 | 5838 | 9152 |

Паводле дадзеных Камітэта па разборы і апекаванні жабракоў, якія апублікаваны ў зборніку «Благотворительность в России», галоўны кантынгент беднякоў у Еўрапейскай Расіі ў канцы XIX ст. складалі сяляне (84,6% ад іх агульнай колькасці), мяшчане і рамеснікі – 12,4%, дваране – 5,4%, а духоўныя асобы, ганаровыя грамадзяне і купцы – 0,2%, 0,1% і 0,01% (адпаведна). Асноўная іх маса – 90,6% – была непісьменнай; 6,6% валодалі граматай, але нідзе не навучаліся; 2,6% скончылі пачатковыя навучальныя ўстановы і толькі 0,16% – сярэднія навучальныя ўстановы.

Па канфесійнай прыналежнасці асноўную масу жабракоў складалі асобы праваслаўнага веравызнання – 81,6%, каталіцкага – 7,1%, стараверы – 3,2% і іудзейскага веравызнання – 3,9%.

Аб тэрытарыяльнай мабільнасці можна меркаваць па звестках аб месцы нараджэння жабракоў. Большасць складала мясцовае насельніцтва – 80,7%, 8,8% – выхадцы з суседніх паветаў, 10,2% – з іншых губерняў і 0,2% – з іншых краін.

Узрост жыхароў «сацыяльнага дна», паводле дадзеных зборніку «Благотворительность в России», уключаў асоб абодвух палоў ад немаўляцтва да глыбокай старасці. Самую вялікую колькасць прадстаўлялі жабракі ўзроставай групы ад 60 гадоў і болей – 37,6%, з немаўляцтва да 20 гадоў – 21,4%, ва ўзросце 50–59 гадоў – 13,6%, 40–49 – 10,8% і 30–39 гадоў – 7,6%.

Для больш дасканалага вывучэння жабрацкага жыцця рускія даследчыкі XIX ст. І. Прыжкоў і Д. Лінёў звярталіся да таго, што ў сучаснай сацыялогіі называюць «уключаным назіраннем»: уваходзілі ў асяроддзе жабракоў як «свае» і такім чынам дасягалі выключнай дакладнасці звестак. «Каго толькі не сустрэнеш сярод жабракоў: тут і баба з паленам замест немаўляткі, «нязрачыя, якія бачаць», храмыя, якія могуць бегаць, бязбожнікі, збіраючыя «на храм» і г.д.» [8]. Трэба адзначыць, што сярод жабракоў значную частку складалі псеўдабеднякі, якія прыкідваліся ўбогімі (у агульнай масе жабруючых яны складалі ад 1/3 да 1/2) [16, с. 411]. Сустракаліся таксама працуючыя па прызначэнні – «добраахвотныя» жабракі, якія займаліся сваім рамяством нават у тым выпадку, калі была магчымасць працаваць сумленна. Сярод збіраючых міласціну вызначаліся і патомныя жабракі, якія займаліся сваёй «справай» з пакалення ў пакаленне з прычыны «выхавання» вуліцай, маральнай дэфармацыі і фізічнага выраджэння. Трэба адзначыць таксама існаванне сітуатыўных або вымушаных з-за збегу абставін жабракоў (няўдачы, драмы, абставіны жыцця, сіроцтва, старасць, хвароба і г.д).

У даследчыкаў сустракаліся розныя падыходы да падзелу жабракоў на катэгорыі і групы. Так, расійскі вучоны А. Бахціяраў пабудаваў тыпалогію жабракоў. У аснову былі пакладзены з аднаго боку матывы жабрацкай дзейнасці, як яны ўсведамляліся самімі жабракамі; а з другога – асабістыя адносіны да жабракоў таго, хто ім падае. Асобна А. Бахціяраў адзначыў магчымыя практычныя меры барацьбы з жабрацтвам. У адпаведнасці з вызначанымі крытэрыямі ён выдзеліў шэсць розных груп жабракоў.

*Першую групу* складалі асобы «злой волі» і штучнай хітрасці, якія разумелі амаральнасць сваёй дзейнасці, але працягвалі займацца гэтым рамяством, нават калі з'яўлялася магчымасць жыць інакш. Рэакцыя людзей на гэтых фальшывых старцаў – падазронасць і грэблівасць. У дачыненні да гэтай групы навуковец прапаноўваў толькі карныя меры. У *другую групу* ўваходзілі асобы, якія не зусім усведамлялі амаральнасць падмана і займаліся жабрацтвам «несвядома» і добраахвотна. Адносіны асяроддзя да гэтай групы былі не зусім адмоўныя. Для гэтай групы даследчык прапанаваў больш мягкую сістэму мер прымусовай працы, маральнае выхаванне і простую чалавечую ўвагу. У *трэцюю групу* А. Бахціяраў аднёс асоб, якія не ўсведамлялі ганьбы жабрацтва і звязанага з ім падмана з прычыны сваёй маральнай і фізічнай

дэградацыі. Часам гэта былі жабракі другога, а то і трэцяга пакаленняў, часам калекі. Для такіх асоб, па меркаванні аўтара, патрэбны былі не турмы і карныя меры, а прытулкі і лячэбніцы. *Чацвёртая група* – гэта асобы, якія жабравалі пад знешнім націскам абставін жыцця або нейкай асобы (напрыклад, галава сям'і прымушаў жонку і дзяцей збіраць міласціну або эксплуатаваліся наёмныя жабракі). Гэтыя пакутнікі з-за сваёй галечы не маглі не выклікаць чалавечага спачування і спагадлівасці. Ім неабходны быў шэраг арганізацыйных дзяржаўных і грамадскіх мер. *Пятую групу* складалі асобы, якія кіраваліся рэлігійнымі меркаваннямі. Збор міласціны разглядаўся імі як справа «заўгодная Богу». У веруючых яны сустракалі падтрымку і спачуванне, асабліва ў аднаверцаў. Для знішчэння такога жабрацтва А. Бахціяраў прапануе таксама шэраг арганізацыйных дзяржаўных і грамадскіх мер. У *шостую групу* ўваходзілі асобы глыбока перакананыя ў сваім жыццёвым праве на міласціну, якія не заўважалі, што яна прыніжае чалавечую годнасць. Часцей гэта былі старыя, якія ўсё жыццё працавалі для лепшай долі, і якія спадзяваліся пад канец жыцця атрымаць адпачынак ад працы і клопатаў. Вырашэнне гэтай праблемы бачылася ў забеспячэнні старасці грамадзян [9].

Іншую тыпалогію жабракоў прапаноўвалі даследчыкі XIX ст. А. Свірскі і свята Бірукоў. Яны падзялялі жабракоў на гарадскіх і сельскіх. А. Свірскі прапанаваў тыпалогію гарадскіх жабракоў, раздзяляючы іх на розныя спецыяльнасці па віду прашэння міласціны. Ён вылучаў сярод жабракоў два класы: 1) хрыстараднікі (жабракі) і 2) паляўнікі (жабракі вышэйшага сорту). Хрыстараднікі ў сваю чаргу падзяляліся на 9 відаў: а) багамолы (прасілі міласціну на царкоўнай паперці); б) магільшчыкі (прасілі міласціну на могілках); в) гарбачы (жабравалі з сумою); г) ерусалімцы (прытворныя вандроўнікі); д) чыгуначнікі (прасілі ў вагонах цягнікоў); е) севастопальцы (салдаты); ж) барабаншчыкі (стукаліся пад вокнамі); з) бязроднікі (брадзягі); і) складчыкі (бралі міласціну не толькі грашыма, але і хлебам, яйкам, гароднінай). «Паляўнікі» падзяляліся на 4 віды: а) байкары (падавалі дабрачынныя прасіцельскія пісьмы); б) пратэкцыяністы (з'яўляліся нібыта па рэкамендацыі знаёмага); в) пагарэльцы (сцвярджалі, што яны былі вельмі багатыя, але ўсё згарэла); г) перасяленцы (сяляне, якія ніколі не бачылі вёскі) [2].

Асаблівае значэнне для багамолаў і магільшчыкаў мелі храмавыя святы. У гэты час да мясцовых прыходаў збіраліся сотні жабракоў не толькі з павета, але і суседніх губерняў. Напрыклад, у Віцебскім павеце было сяло Жарэбічы, дзе была пабудавана царква Святой пакутніцы Параскевы і Маркаў манастыр. У Лепельскім павеце ў дзесяці вёрстах ад г. Лепеля знаходзілася ўрочышча «Бароўна». Там знаходзіўся храм, у які на Пятроў і Троіцын дзень збіраліся тысячы вернікаў, што прыцягвала жабракоў, як сапраўдных, так і прафесійных. Іх збіралася сюды да пяцідзесяці чалавек [17]. А. Свірскі і А. Паліян сцвярджалі, што сярод багамолаў і магільшчыкаў не было ніводнага не прафесійнага жабрака [2, с. 52].

А.І. Свірскі таксама больш падрабязна спыняўся і характарызаваў такую группу, як *пагарэльцы*. Шмат сялян, гаспадаркі якіх былі спустошаны агнём, вымушаны былі прасіць міласціну, але не меншую колькасць з іх складалі прафесійныя жабракі, якія эксплуатавалі даверлівасць добрых людзей. Мужчына-жабрак дамаўляўся на пэўных умовах з жабрачкай, наймаў за плату дзяцей і рабіў выгляд мужыка, засмучанага горам. І часам, калі сапраўды здараўся пажар, напрыклад, калі згарэў Брэст, то ў суседніх гарадах з'явілася такая колькасць «пагарэльцаў», што іх цяжка было адрозніць ад тых, хто сапраўды пацярпеў ад агню [2, с. 57–59]. У Віцебскім павеце кожную восень заўважаўся наплыў жабракоў пад выглядам пагарэльцаў, якія «зараблялі» зборам зерня і шматкоў хлеба. Гэта былі прафесійныя жабракі, так званыя

«шматочнікі» са Смаленскай губерні, дзе цэлыя сёлы пагалоўна займаліся гэтым рамяством [18].

Расійскі даследчык жабрацтва А. Левенсцім адзначаў, што класіфікацыя А.Свірскага не зусім дакладная, у сувязі з тым, што пагарэльцы і перасяленцы хутчэй павінны быць аднесены да ліку жабракоў, а не да ліку паляўнічых, большасць з якіх складалі пісьменныя і інтэлігентныя людзі. Па меркаванні А. Левенсціма, найбольш дакладная класіфікацыя А. Паліяна. Ён падзяліў жабракоў на 2 катэгорыі: служба аседлая і служба дзейная. Першыя чакаюць сваю ахвяру (на вуліцы, ля царквы, на могілках), другія шукаюць і ідуць да яе самі. А. Левенсцім лічыў, што спіс А. Свірскага не зусім поўны і папоўніў яго наступнымі відамі жабрацтва: жанчына з хворым дзіцём, якая часам замест дзіцяці трымала простае палена; збіранне міласціны на пахаванне, на пасаг нявесце, па слабасці здароўя, на паўшага або эпнуўшага каня, на білет для вяртання на радзіму; калекі і нязрачыя; высакародныя, якія пацярпелі за праўду; згінуўшыя купцы і студэнты; картыншчыкі, музыкі, дзеці з вывучанымі жывёламі [2, с. 49].

Даследчыкі вызначалі яшчэ адзін асобны від жабрацтва і галоўным чынам жабрацтва сялянскага – гэта царкоўныя збіральцы. Такія збіральцы ў Магілёўскай губерні насілі назву *кубракоў*, у Гродзенскай іх называлі *лабарамі*. Жылі яны заможна, нават багата, але сярод аднавяскоўцаў карысталіся самай незайздроснай рэпутацыяй. Існавала нават павер'е, што памерлых кубракоў хаваць на вясковых могілках нельга, каб не наклікаць засуху або бездарожжа, а належыць рыць ім магілкі ў полі ля карчмы. Але самі кубракі казалі, што іх справа патрабуе навукі і грошай. І сапраўды, акрамя вопытнасці і ўмення, менш чым з двумастамі рублямі кубраку адправіцца ў шлях было нельга. Кубрак шукаў бедны царкоўны прыход, збіраў патрэбныя дакументы, атрымліваў зборную кніжку і адпраўляўся на некалькі месяцаў збіраць грошы. Але ў выніку царква атрымлівала толькі 10–20% ад агульнай сумы збораў. Вядомы такія выпадкі, калі, напрыклад, лабары Гродзенскай губерні Кобрынскага павета, збіраючы на храм, прыйшлі ў Віленскай губерні да набожнай старухі, якая пакутавала ад невылечнай хваробы. Выдаючы сябе за ксяндзоў з Рыма выбавілі ў яе 1000 рублёў на пабудову новага касцёла. На шчасце, з'явіўся сын жанчыны, паклікаў суседзяў і затрымаў злачынцаў. А. Левенсцім прыгадваў яшчэ адзін выпадак, калі лабары наведалі селяніна Брэсцкага павета. Выдаючы сябе за апосталаў, загадалі яму служыць Богу, быць прарокам і вучыць людзей. Пры невыкананні загаду пагражалі падзяжом жывёлы і смерцю родных. На могілках, пад новым крыжам, паказалі месца, дзе выбраны прарок мог знайсці грамату на пасланцтва. Тым часам злодзеі ўзялі ўсе грошы, рэчы і зніклі. Падмануты да вар'яцтва ўвераваў у іх словы, пакінуў сваю гаспадарку і стаў бадзяцца па вёсках [2, с. 142]. Акрамя гэтага, лабары выдавалі сябе для павелічэння прыбытку за знахароў, лячылі жывёлу і прадавалі любоўнае зелле.

У паўднёвых і ўсходніх паветах Беларусі быў найбольш распаўсюджаны тып жабракоў-спевакоў. Апранутыя ў белыя адзенні, у лапцях з белымі анучамі, з торбамі і кіямі ў руках. Па хрысціянскіх святах яны хадзілі па хатах і спявалі псалмы, збіраючы міласціну, гаспадары частавалі старцаў і вялі бяседу аб навакольных навінах. Для вывучэння псалмоў, якія спявалі жабракі, існавалі асобыя «майстры» – часцей гэта і былі сляпыя старцы. Да іх пачынаючыя ішлі з большым жаданнем, чым у багадзельні. Навучанне працягвалася адзін год, а часам і болей. Яно праходзіла з голаса, па напеву; «славесная» навука існавала толькі для растлумачвання незразумелых слоў. Аплата майстру складала 1–3 руб. без уліку ўтрымання і пры выкананні хатніх і палявых работ. Аплата ажыццяўлялася заўсёды наперад. Пры заканчэнні вывучкі вучань абавязаны быў на свой лік як мага лепей пачаставаць майстра,

а затым пры сустрэчы кожны раз падносіць яму шкалік гарэлкі і булку. Лепшыя старацкія школы знаходзіліся ў Жарэбні Гомельскага павета, у Гарадцы і Залессі Рагачоўскага павета, у Хатавежы Клімавіцкага павета і інш. [7].

Сустракаліся сярод жабракоў і тыя, у каго захаваліся рэшткі працоўнай этыкі. Яны жадалі знайсці працу і пакінуць пастылае жабрацтва, згаджаючыся на любую працу за мінімальны кошт Улетку яны аб'ядноўваліся ў лясныя артэлі для збору грыбоў і ягад на продаж, а ўзімку зноў звярталіся да ранейшага рамяства, «асцярожна» збіраючы міласць у мінімальных памерах – «толькі на кроў і дзённы пражытак». Аднак такіх жабракоў было вельмі мала.

Агульнавядомы факт, што жабракі атрымлівалі больш сродкаў, чым многія з фабрычных рабочых, служачых у дробных рамесных установах. Адмаўляючыся ад заробку асабістай працай, казалі: «Мы ў 2 разы больш назбіраем сумою; будзем 2 разы ў дзень піць гарбату з баранкамі і гарэлкай, ды яшчэ на табак застанецца, спаць будзем у доваль, а не плечы ламаць...» [2, с. 38]. Падавалі жабракам разнастайнае: грошы, адзенне і ежу. На гарадскіх вуліцах – капейкі, у булачных – чэрствы хлеб, у калбасных – шматкі мяса, на сяле жабракоў кармілі, пускалі на ноч у хату і частавалі, а нязрачым падавалі яйкі, а восенню – зерне. Гэтая міласціна абарачалася часам у грошы: хлеб прадавалі на корм жывёле, а зерне – спецыяльным скупшчыкам. Напрыклад, у Вільні і Гродзенскай губерні міласць, у асноўным, падавалі скібкай хлеба, што навукоўцы растлумачваюць як усталяваўшыміся традыцыямі, так і тым, што насельніцтва гэтых губерній было адносна бяднейшым [13].

Свой прыбытак жабракі выкарыстоўвалі па-рознаму. Трэба адзначыць, што мужчыны-жабракі часта ўвесь даход прапівалі. Але часам жабракі збіралі значны капітал. На сябе яны трацілі вельмі мала. Жанчыны часам, назбіраўшы грошай, аддавалі іх пад працэнты, увесь час павялічваючы капітал. Часам з'яўляліся звесткі аб скандальна багатых вяселлях сярод жабракоў.

Такім чынам, удзельная вага жабракоў сярод насельніцтва Беларусі была нязначнай і складала ўсяго каля 0,15%. У той жа час жабракі былі неад'емнай часткай беларускага грамадства. Жабрацтва з'яўлялася адлюстраваннем сацыяльна-эканамічных працэсаў, якія адбываліся ў грамадстве ў другой палове XIX ст. Своеасаблівым водгукам на гэтыя псіхалагічныя жахі грамадства можна лічыць шырокую спецыялізацыю жабракоў, унутрыгрупавую іерархію, а таксама існаванне традыцыйных прыёмаў і метадаў збору міласціны. Важна адзначыць, што беларускае грамадства і ўрадавыя колы добра разумелі прычыны паходжання жабрацтва. Яны ўсяляк імкнуліся пераадолець гэтую заганную з'яву, бо заўсёды існавала псіхалагічная магчымасць апынуцца сярод жабракоў.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Бахтиаров А.*** Босяки. Очерки с натуры. – СПб., 1903. – 108 с.
2. ***Левенстим А.*** Профессиональное нищенство: его причины и формы. Бытовые очерки А. Левенстима. – СПб., 1900. – С. 32–147.
3. ***Антология социальной работы*** / Сост. ***М. Фирсов***. – М., 1995. – Т. 2: Феноменология социальной патологии. – 397 с.
4. ***Прыжков И.*** История нищенства, кабачества и кликушничества на Руси. – М., 1997. – С. 134–143.
5. ***Свирский П.*** Погибшие люди. Мир нищих и пропойц. – СПб., 1898. – Т. 3. – С. 2–3.
6. ***Никифоровский Н.*** Очерки Витебской Белоруссии. Вып. 1. Старцы. – М., 1892. – С. 20–33.
7. ***Романов Е.*** Очерк быта нищих Могилевской губернии // Этнографическое обозрение, 1890, № 4. – Кн. 7. – С. 118–127.
8. ***Голосенко И.*** Нищенство в России (из истории дореволюционной социологии бедности) // Социологическое исследование, 1996, № 8. – С. 18–25.

9. ***Голосенко И.*** Нищенство как социальная проблема // Социологическое исследование, 1996, № 7. – С. 27–35.
10. ***Кузнецова Н.*** Проблемы нищенства в России (на материале Москвы 1860–1917): Автореф. дисс. ...канд. ист. наук. – М., 1999. – 34 с.
11. ***Рождественская Н.*** Нищенство и благотворительность в Костромской и Ярославской губерниях в конце XIX – начале XX в. – Ярославль, 2004. – 24 с.
12. ***Григорьев А.*** Общественное призрение и благотворительная помощь у белорусских крестьян на рубеже XIX–XX вв. // Социально-педагогическая работа, 1997, № 3. – С. 62–74.
13. ***Григорьев А.*** Социальная работа на Беларуси: история, опыт, проблемы. – Мн., 2000. – С. 22–23.
14. ***Тищенко Е.*** Здравоохранение Беларуси в XIX–XX веках: Монография. – Гродно, 2003. – 269 с.
15. ***Мельников В., Холостова Е.*** История социальной работы в России: Учебное пособие. – 3-е изд. – М., 2006. – 340 с.
16. ***Добреньков В., Кравченко А.*** Социальная структура и стратификация. – М., 2000. – Т. 2. – С. 387.
17. ***Благотворительность в России.*** – СПб., 1907. – Т. 1. – С. 2.
18. ***Национальный архив Республики Беларусь.*** Ф. 1430, воп. 1, спр. 43887. – Л. 16, 34, 54.

*S U M M A R Y*

*The article is devoted to the problem of social bottoms which is outlined by a theme of beggars. The author gives a general characteristic of the elements of social disorganization and national belonging of beggars, their creed, literacy and education, the marital status and activity.*